***В.М. Саўчанка*** (Магілёў)

## ЗВЫШФРАЗАВАЕ ЦІ ЗВЫШСКАЗАВАЕ АДЗІНСТВА?

Складанае сінтаксічнае цэлае, перыяд і абзац з'яўляюцца вызначальнымі структурна-стылістычнымі і кампазіцыйна-сінтаксічнымі кампанентамі тэксту. Як цэласныя адзінкі маўлення яны сэнсава вылучаюцца з тэк-



Архив библиотеки МГУ имени

сту і ўяўляюцца своеасаблівым структурным комплексам сказаў рознай будовы (простых і складаных, развітых і неразвітых, ускладненых, камбінаваных), аб'яднаных інтанацыйна, раскрываючы адну з мікратэм мікра- і макратэксту. У лінгвістычнай літаратуры найбольш пашыраны ў дачыненні да канструкцый такога тыпу тэрмін «звышфразавыя адзінствы» [2; 4; 6]; значна радзей выкарыстоўваецца тэрмін «звышсказавыя адзінствы» [1; 3]. Па сутнасці, назвы абодвух тэрмінаў выходзяць да паняццяў «фраза» і «сказ», што вымушае звярнуцца да іх тлумачэння. У «Слоўніку-даведніку лінгвістычных тэрмінаў» Д.Э. Разенталя і М.А. Целянковай сказ у асноўным яго значэнні тлумачыцца як мінімальная адзінка маўлення, «граматычна арганізаванае спалучэнне слоў (ці слова), якое валодае сэнсавай і інтанацыйнай завершанасцю [7, с. 227]; фразай называецца «найменшая адзінка маўлення, якая выступае як адзінка зносін [7, с. 377]. У такім разуменні названыя паняцці супадаюць, а значыць, тэрміны «звышсказавыя адзінствы» і «звышфразавыя адзінствы» можна лічыць узаемазамяняльнымі.

Зварот да навуковых крыніц выяўляе неаднастайнасць у вызначэнні паняцця сказа: існуе больш за 200 яго розных азначэнняў (Ф.І. Буслаеў, А.А. Патабня, Д.М. Аўсяніка-Кулікоўскі, Ф.Ф. Фартунатаў, В.У. Вінаградаў, А.М. Пяшкоўскі, Л.І. Бурак, Г.Н. Клюсаў і інш.). Некаторыя лінгвісты размяжоўваюць паняцці, выражаныя тэрмінамі «сказ» і «фраза». Так, у даследаваннях А.М. Пяшкоўскага *сказам* называецца «ўсялякае ўласна фармальнае адзінства, якое выражае закончаную думку» [5, с. 12], а *фразай* – «усялякае рытмамеладычнае адзінства» [5, с. 14]. Выходзячы з такога разумення, можна вылучыць наступныя адрозненні паміж сказам і фразай:

1) наяўнасць прэдыкатыўнага ядра абавязковая для сказа, але не заўсёды ўласціва фразе (напрыклад, у выпадку з парцэляванымі і сегментаванымі адрэзкамі маўлення);

2) прэдыкацыя ўяўляецца як паведамленне, суаднясенне зместу выказвання да рэчаіснасці і таму выступае як абавязковая і неад'емная прымета сказа. І.Р. Гальперын прапаноўвае разглядаць прэдыкацыю з двух бакоў: фармальна-структурнага і змястоўнага: «Фармальна-структурны аналіз прэдыкацыі патрабуе ўдакладнення таго элемента ў паведамленні, які нясе на сабе асноўны груз інфармацыі... Змястоўны аспект прэдыкацыі не абмяжоўваецца аналізам такога элемента, як рэма, а распаўсюджваецца часам на ўсё паведамленне... Таму можна сказаць, што ў працэсе паведамлення... тэма пачынае набываць нейкія дадатковыя прыметы, раней невядомыя ці незаўважаныя» [2, с. 100]. У дачыненні да фразы праяўленне змястоўнага аспекту прэдыкацыі абавязковае, а фармальна-структурны пункт погляду ўласцівы для фразы толькі ў тым выпадку, калі яна супадае са сказам;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) фраза ўяўляецца як рытмамеладычнае адзінства, сказ жа часта аказваецца пазбаўленым рытмамеладычных уласцівасцяў.

Параўнанне прэдыкатыўнасці, інфармацыйнасці і інтанацыйнай арганізацыі сінтаксічных адзінак дазваляе сцвярджаць, што камунікацыйны аспект любога тэксту праяўляецца ў сукупнасці адзінак, большых за сказ.

Аналіз азначэнняў абзаца, перыяду і складанага сінтаксічнага цэлага зноў жа пацвярджае іх сувязь са сказам: «Абзац – адрэзак пісьмовага ці друкаванага тэксту ад аднаго чырвонага радка да другога, звычайна заключае ў сабе звышфразавае адзінства ці яго частку, радзей – адзін просты ці складаны *сказ* [тут і далей выдзелена аўтарам. – *В.С.*]» [7, с. 8]; «Перыяд – моцна развіты просты *сказ* ці мнагачленны складаны сказ, які характарызуецца з боку зместу значнай паўнатой і завершанасцю выражэння думкі, адзінствам тэмы, а з боку інтанацыі распадзеннем на дзве часткі: павышэнне і паніжэнне [7, с. 203]; «Складанае сінтаксічнае цэлае – група цесна ўзаемазвязаных закончаных *сказаў*, якія ўтвараюць асобую сінтаксіка-стылістычную адзінку» [7, с. 314].

Такім чынам, прытрымліваючыся традыцыйнасці пры ўжыванні тэрміна «звышфразавае адзінства», неабходна ўказаць на яго недасканаласць: структурна-сінтаксічная характарыстыка абзаца, перыяду і складанага сінтаксічнага цэлага абапіраецца на іх сувязь са сказам, а не з фразай. Правядзенне паралелі са сказам абгрунтоўвае звышсказавы (або надсказавы) характар адзначаных элементаў, таму паняцце «звышсказавыя адзінствы» найпаўней адпавядае сутнасці тэрміна і мае не такія супярэчлівыя абгрунтаванні для ўключэння ў данае паняцце абзацаў.

**Літаратура**


1. **Бурак, Л.І.** Звышсказавае адзінства і яго інтанацыйныя асаблівасці / Л.І. Бурак // Беларуская мова: межвед. зб. – 1988. – Вып. 16. – С. 90-98.
2. **Гальперин, И.Р.** Информативность единиц языка: пособие по курсу общего языкознания / И.Р. Гальперин. – Москва: Высшая школа, 1974. – 175 с.
3. **Клюсаў, Г.Н.** Асновы і нормы сучаснай беларускай пунктуацыі / Г.Н. Клюсаў. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 1993. – 268 с.
4. **Маслов, Б.А.** Проблемы лингвистического анализа связного текста (надфразовый уровень) / Б.А. Маслов. – Таллин, 1975. – 104 с.
5. **Пешковский, А.М.** Русский синтаксис в научном освещении / А.М. Пешковский. – 8-е изд. – Москва: Эдиториал УРСС, 2001. – 450 с.
6. **Розенталь, Д.Э., Теленкова, М.А.** Словарь-справочник лингвистических терминов / Д.Э. Розенталь, М.А. Теленкова. – Москва: Просвещение, 1985. – 399 с.
7. **Реферовская, Е.А.** Лингвистические исследования структуры текста / Е.А. Реферовская. – Ленинград: Наука, 1983. – 216 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова